УДК 378.016:34

***А.М. Сувалаў***, *намеснік начальніка кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*
***А.М. Сувалава***, *старшы выкладчык кафедры філасофіі і ідэалагічнай работы Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*

# АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ ПА ГІСТОРЫКА-ПРАВАВЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ У АКАДЭМІІ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Самастойнасць – адна з вядучых якасцей чалавека, якая выяўляецца ва ўменні ставіць перад сабой пэўныя мэты і дамагацца іх дасягнення ўласнымі сіламі. У шырокім сэнсе гэта якасць мяркуе адказнае стаўленне асобы да сваіх паводзін, здольнасць дзейнічаць свядома і ініцыятыўна не толькі ў знаёмай абстаноўцы, але і ў новых умовах, якія патрабуюць прыняцця нестандартных рашэнняў. Самастойнасць не з'яўляецца прыроджанай рысай чалавека, а фарміруецца па меры яго сталення, і не ў апошнюю чаргу ў працэсе яго навучання.

Ва ўмовах сучасных тэндэнцый у айчыннай адукацыі, якія звязаны са скарачэннем аўдыторнай нагрузкі, павялічваецца важнасць рацыяналізацыі пры арганізацыі самастойнай працы навучэнцаў, умацаванне сувязей адукацыі з будучай прафесійнай дзейнасцю. Адной з галоўных мэт навучання з'яўляецца не перадача той ці іншай інфармацыі ад выкладчыка да курсанта, а выпрацоўка ўменняў і навыкаў самастойнай працы курсанта па атрыманню, асэнсаванню і аналізу неабходнай інфармацыі, арыентацыі ў пастаянна ўзрастаючым патоку інфармацыі. Менавіта такі фундамент, які закладваецца ў асноўным дзякуючы самастойнай працы курсанта, і дае магчымасць падрыхтаваць афіцэра праваахоўных органаў, які здатны самастойна рашаць пастаўленыя перад ім задачы незалежна ад ступені іх складанасці і нетыповасці, аператыўна рэагаваць на сітуацыю, а не чакаць дадатковых распараджэнняў ад вышэйстаячых начальнікаў і кіраўнікоў.

Аналізуючы методыку арганізацыі самастойнай працы ў Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, неабходна ўлічваць шэраг фактараў, як агульных для ўсіх устаноў вышэйшай адукацыі, так і спецыфічных, уласцівых для ўстаноў праваахоўнага блока.

Па-першае, перанясенне акцэнту з аўдыторных заняткаў на самастойную працу курсантаў патрабуе выкарыстоўваць большую, чым раней, колькасць методык выкладання. У гэтым плане найважнейшым метадам павінна стаць індывідуальная работа з курсантамі. Выяўленне

ўзроўню падрыхтаванасці курсанта, яго асабістых схільнасцей і інтарэсаў у сукупнасці з матывацыяй яго з боку выкладчыка, курсавога звяна і кіраўніцтва факультэта стварае першасную аснову для арганізацыі самастойнай працы курсанта.

Па-другое, неабходна фарміраваць у курсанта навыкі адэкватнай самаацэнкі ўласных ведаў і уменняў, а на іх аснове – навыкі пастаноўкі планаў самаразвіцця з падзелам гэтых планаў на этапы бліжэйшай, сярэдняй і аддаленай перспектывы. Указаны падзел на этапы мае важнае значэнне, паколькі дазваляе курсанту не толькі фарміраваць навыкі высокай самастойнасці, навыкі самакантролю і ўменне карэктаваць свае планы ў працэсе іх рэалізацыі, але і адчуць гонар і задавальненне пры паспяховым выкананні бліжэйшых пастаўленых мэт. Гэты аспект ні ў якім разе нельга пакідаць па-за ўвагай, паколькі, па нашаму глыбокаму перакананню, пазітыўнае ўспрыняцце курсантам дзейнасці па набыццю ведаў і прафесійнаму самаразвіццю выступае сур’ёзным гарантам устойлівай матывацыі яго да далейшай работы над сабой, а таксама ў пэўнай ступені спрыяе замацаванню пазітыўнага стаўлення будучага афіцэра да сваёй прафесіі.

Каб на высокім узроўні арганізаваць самастойную працу курсантаў, неабходна ўлічваць як арганізацыйныя, так і педагагічныя магчымасці навучальнай установы ў гэтым кірунку.

Да арганізацыйных трэба аднесці наяўнасць пэўнай матэрыяльна-тэхнічнай базы (напрыклад, моцныя бібліятэчныя фонды, камп’ютарныя класы, магчымасць карыстацца інтэрнэт-рэсурсамі і інш.), а таксама падрыхтаванасць выкладчыкаў да якаснай арганізацыіі самастойнай працы навучэнцаў.

Да педагагічных магчымасцей адносяцца вучэбна-метадычныя дапаможнікі для выканання курсантамі самастойнай працы па гісторыка-прававых дысцыплінах; мэтанакіраванае выкарыстанне гадзін самападрыхтоўкі для арганізацыі самастойнай працы курсантаў; арганізацыя самастойнай працы курсантаў падчас аўдыторных заняткаў: праца курсантаў на лекцыях, самастойная праца на занятках ў камп’ютарных класах; арганізацыя самастойнай працы курсантаў у пазааўдыторнай дзейнасці: удзел у алімпіядах, кафедральных і межкафедральных канферэнцыях, даследчай працы.

Важнае месца ў арганізацыіі самастойнай працы курсантаў належыць выкладчыкам. Яны павінны перш за ўсе выразна ўяўляць сабе вынікі самастойнай працы курсантаў як на занятках у аўдыторны час, так і ў гадзіны самападрыхтоўкі. Для гэтага неабходна прааналізаваць змест вучэбных праграм па гісторыка-прававых дысцыплінах, вызначыць міжпрадметныя сувязі, распрацаваць рэкамендацыі і вучэбна-метадычныя дапаможнікі для выканання курсантамі самастойнай працы ў працэсе вывучэння азначаных прадметаў. Рэкамендацыі павінны

ўтрымліваць патрабаванні да мінімальнага аб’ёму ведаў курсантаў па вывучаемых тэмах, алгарытмы выканання прапанаваных заданняў, спісы асноўнай і дадатковай літаратуры, даведачныя матэрыялы, а вучэбна-метадычныя дапаможнікі дадаткова асвятляць тэарэтычныя палажэнні, выкладзеныя на занятках. Пры гэтым вучэбны матэрыял трэба падбіраць з мэтай не толькі фарміравання ведаў, уменняў і навыкаў курсантаў па прадметах гістарыка-прававога цыкла, але і прымянення атрыманых ведаў, развіцця ўменняў і навыкаў у далейшым вывучэнні імі агульнапрафесійных і прафесійных дысцыплін.

Такім чынам, арганізацыю самастойнай працы курсантаў па гісторыка-прававых дысцыплінах трэба разглядаць як цэласны педагагічны працэс, накіраваны на падрыхтоўку і выхаванне асобы, якая характарызуецца ініцыятыўнасцю, крытычнасцю, адэкватнай самаацэнкай і пачуццём асабістай адказнасці за сваю дзейнасць і паводзіны.

УДК 378

***В.А. Талалаев****, начальник кафедры юридических дисциплин факультета внутренних войск Военной академии Республики Беларусь;*
***С.В. Павлющик****, заместитель начальника кафедры юридических дисциплин факультета внутренних войск Военной академии Республики Беларусь*

## ОБ ИСПОЛЬЗОВАНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ СРЕДСТВ ОБУЧЕНИЯ ПРИ ПРОВЕДЕНИИ ОТДЕЛЬНЫХ ВИДОВ ЗАНЯТИЙ

Дальнейшее совершенствование сферы инновационной деятельности в системе образования является важнейшим условием прогрессивного развития государства. Образовательный процесс предполагает обучение и воспитание в целях освоения обучающимися содержания образовательных программ. Возросшие требования современности в качестве приоритета в образовательном процессе определяют качество решения задач дальнейшей службы обучающимися. Это в определенной мере обусловливает модернизацию структуры методического обеспечения процесса обучения, в котором особую значимость приобретает использование новых форм, видов и способов представления информации применительно к специфике занятий отдельных видов.

Одной из основных форм организации образовательного процесса при реализации образовательных программ являются лекции, которые составляют основу теоретического обучения. Они ориентированы на получение обучающимися систематизированных научных знаний по